Як растлумачыць няверуючаму чалавеку, чаму захоўваю пост і хаджу ў нядзелю ў касцёл?

Аўтар: grodnensis.by
12.09.2021 00:00

Размова з няверуючым чалавекам (атэістам ці агностыкам) заўсёды нялёгкая, таму што закранае розныя пытанні адносна веры ў Бога.

У такім выпадку трэба найперш размаўляць пра існаванне Бога, пра мой вобраз Бога і пра ўласны досвед веры ў Яго. Няма сэнсу адразу разважаць пра нейкія справы, звязаныя з дысцыплінай Касцёла, таму што няверуючаму гэта будзе незразумела. Чаму? Бо ён не верыць у Бога, а значыць, усё іншае, звязанае з рэлігіяй, не мае сэнсу.† Наст упным крокам будзе размова пра хрысціянскі лад жыцця (малітва, св. Імша, пост і г. д). Канешне, прыклад веры прыцягвае, і чалавек пачынае цікавіцца. Калі няверуючая асоба гатова слухаць аргументы другога боку, то гэта ўжо вельмі добра. Найперш, падчас размовы трэба распавесці ўласнае сведчанне пра сустрэчу з Богам і як Ён дзейнічае ў маім жыцці – бо гэта самы важкі аргумент!

Нават тэалагічныя кнігі не ўзбудзяць веру, бо даюць толькі веды! Вера – гэта маé асабістыя адносіны з Богам! Чаму я веру і люблю Бога? Чаму выбіраю Яго штодня ў сваім жыцці? Чаму гэта вельмі важна для мяне асабіста? Бо менавіта з гэтага вынікае маё жаданне захоўваць пост у пятніцу – дзень смерці Хрыста – і прысутнічаць на нядзельнай Эўхарыстыі – сустрэчы з Уваскрослым!

У такой сітуацыі не трэба вялікіх багаслоўскіх аргументаў. Тут усё вельмі асабіста. Спрабаваць размаўляць трэба заўсёды – бо гэта магчымасць абвяшчаць Евангелле!